**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**
**АДДЗЯЛЕННЕ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК І МАСТАЦТВАЎ**
**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ**
**ДЗЯТЛАЎСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

праводзяць навукова-практычную канферэнцыю

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ДЗЯТЛАЎШЧЫНЫ (ДА 520-ГОДДЗЯ ГОРАДА)

**Праблемы для абмеркавання:**

- ранняя гісторыя Дзятлаўшчыны (па матэрыялах археалагічных даследаванняў);
- Дзятлава ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай;
- Дзятлава ў часы Расійскай імперыі;
- Дзятлаўскі рэгіён у віхурах войн і рэвалюцый;
- Дзятлаўскі раён БССР: стварэнне і развіццё;
- архітэктурная і мастацкая спадчына Дзятлаўшчыны;
- праблемы этна-канфесійнай гісторыі Дзятлаўшчыны;
- славутыя імёны Дзятлаўскай зямлі.

Час правядзення канферэнцыі **14 верасня 2018 г.**

Плануемае месца правядзення канферэнцыі **г. Дзятлава, Гродзенская вобл.**

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца па электроннай пошце: anipiarkou@tut.by да **14 жніўня 2018 г.**

У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго навуковая ступень і званне, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык і яго пасада, назва даклада, кантактны тэлефон, e-mail. Студэнтам і магістрантам разам з заяўкай неабходна даслаць тэзісы даклада (да 2000 знакаў) і водгук навуковага кіраўніка. Замежных удзельнікаў просім паведаміць пра неабходнасць візавай падтрымкі.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі. Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будуць дасланы да **1 верасня 2018 г.**

**Рабочыя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, польская.

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Тэксты прадстаўляюцца ў аргкамітэт па электроннай пошце *anipiarkou@tut.by* да **15 кастрычніка 2018 г.** Патрабаванні да формы і аб'ёма тэкстаў дакладаў: электронны варыянты не болей за 30 000 знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання апускаюцца.

*Кантакт*: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Тэл. (+375 17) 284-14-09, факс (+375 17) 284-18-70; Аніпяркоў Вадзім Вадзімавіч, e-mail: anipiarkou@tut.by

Камандзіровачныя выдаткі за кошт камандзіруючага боку.

**Аргкамітэт канферэнцыі**